Андруковіч Г.А., студ. гр. 302а ФКіСКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Рэмішэўскі К.І.,
кандыдат мастацтвазнаўства

# СТЫЛЕВАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ СУЧАСНАГА МУЗЫЧНАГА КІРУНКУ “МЕТАЛ”

**1. Уводнае слова.** На сённяшні дзень метал музыка з’яўляецца дастаткова буйным сегментам сучаснай масавай культуры. За якія трыццаць год свайго існавання гэтая галіна музычнага мастацтва нагэтулькі шчыльна ўвайшла ў нашае жыццё, што стала цяжка ўʼявіць сабе развіццё музычнай культуры без “металу”. Найпапулярныя прадстаўнікі згаданага музычнага кірунку могуць паспрачацца ў рэйтынгах з прадстаўнікамі іншых кірункаў масавай музычнай культуры, такімі як Мадонна [1], Майкл Джэксан [2], дыскі “Ария”, “Metallica”, “Iron Maiden” ды іншых выходзяць шматмільённымі накладамі, а фестывалі кшталту “Metalmania” у Польшчы [3] ці MHM (Metal head mission) ў Крыме [4] збіраюць тысячы гледачоў. Увогуле, згаданы музычны кірунак сёння “аброс” даволі прыбытковай і перспектыўнай індустрыяй, якая ўключае вялікую колькасць featured рознага кшталту віртуальных і рэальных выданняў, нават энцыклапедычных, музычных праграмаў і праектаў ды, нават, цэлых медыя-рэсурсаў, скіраваных на мэтавую аўдыторыю, а таксама спецыялізаваных гандлёвых сетак распаўсюду, арыентаваных зноў жа на мэтавую аўдыторыю прыхільнікаў метал-музыкі.

**2. Асноўныя апазнавальныя прыкметы.** Асноўнымі стылістычнымі прыкметамі метал-музыкі з’яўляюцца гэтак званыя “цяжкія рыфы”, што здабываюцца з дапамогай гуку электрагітары, апрацаванай праз эфект дысторсіі ці дысторшн (ад англ. “distortion” - скажэнне, гукавы эфект, што дасягаецца праз скажэнне сігналу шляхам яго «жорсткага» абмежавання па амплітудзе); а таксама доўгія гітарныя сола, хоць апошнім часам можна пачуць і бас-сола, і сола іншых інструментаў. Эфект дысторшн, як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кампанент, прысутнічае ў сінтэзатарах, эфект-працэсарах і кампутарных праграмах для апрацоўкі гуку [4].

## Heavy metal

Метал музыка, з'явіўшыся ў 1970-х гадах, прайшла доўгі шлях развіцця. Прашчурамі металу прынята лічыць ангельскі гурт “Black Sabbath”, калі гітарыст, Томі Айомі (Tommy Iommi) і вакаліст Озі Озбарн (Ozzy Osbourne) ад стылю Hard rock паволі перайшлі да стылю Heavy metal.

Са стылю Heavy metal выйшлі такія накірункі як **Thrash metal**. **Power metal**, **Speed metal**.

## Thrash metal

Thrash metal адрозніваецца ад Heavy metal больш жорсткім гучаннем, а таксама тым, што мелодыка ў гэтым стылі падмяняецца рытмікай. Граюць прадстаўнікі дадзенага жанру на больш высокай хуткасці. З Thrash выйшлі, як **Death metal** і **Black metal**.

## Black metal

Для гэтага жанру характэрны больш “высокі” гук screeming vocal. Black metal – адзін з найідэялагізаваных накірункаў у метал-музыцы. З кірунку Black metal выйшла яшчэ некалькі накірункаў. Гэта **Sympho black metal**, **Viking-metal** і **Pagan-metal NSBM (National-Socialistic Black Metal) –**

## Death metal

Для Death metal характэрнае яшчэ больш цяжкое гучанне, чым у Thrash metal. Большасць прадстаўнікоў карыстаюцца вакальнай тэхнікай “Гроўлінг”, Гэты жанр, у сваю чаргу, таксама падзяліўся на такія накірункі, як **Classic**, **Brutal**, **Technical** і **Melodic death metal**, **Death grind**.

## Doom metal

Doom metal адрозніваецца ад усіх папярэдніх накірункаў праз сваю павольнасць і меланхалічнасць сэнсавай тэматыкі. На дадзены момант Doom metal прынята падзяляць на некалькі кірункаў: **Stoner doom metal** , **Sludge doom metal**, **Funeral doom meta**), **Gothic metal**, **Death doom metal**, **Drone metal** ці, дакладней, **Drone-doom**,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Sludge doom metal**

Для кірунку Sludge metal характэрныя цяжкі, агрэсіўны гук, гроулінг-вакал з уплывам стылю Hardcore, рэзкі кантраст тэмпаў грання.

**Gothic metal**

. Для творчасці прадстаўнікоў накірунку характэрнае аб’яднанне гроўлінг-вакалу з класічным чыстым жаночым вакалам, часам, з класічным чыстым мужчынскім вакалам.

**Progressive-metal**

Ад іншых накірункаў яго адрозніваюць складаныя структурныя кампазіцыі, рэзкія змены рытму пасярод кампазіцыі, незвычайныя музыкальныя памеры і прафесійная тэхніка выканання.

**Sympho metal**

У сваёй творчасці прадстаўнікі Sympho metal выкарыстоўваюць высокі жаночы вакал, сімфанічныя інструменты, хор.

**Folk metal**

Спроба звесці ў адзінае кельцкую музыку і Thrash metal. На дадзены момант існуе шмат галінаў дадзенага накірунку.

**Alternative metal**

У 90-я гады ў ЗША з’явілася вялікая колькасць гуртоў, што змешвалі Alternative і Metal музыку На сённяшні момант тэрмін гэты амаль не ўжываецца. Дагэтуль не існуе дакладнай мяжы паміж Alternative rock і Alternative metal.

**Nu metal**

Nu metal мае цяжкое гучанне і разнастайны вакал – як чысты, так і скрым ці рэп-вакал. Гітарныя партыі нескладаныя і рытмічныя.

**Metalcore**

Пэўны кампраміс і нешта сярэднее паміж такімі накірункамі як Hardcore, Punk і Thrash metal, да якога крыху пазней дамяшаліся таксама элементы Hardcore ды іншых паджанраў Металу.

**Industrial metal**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вынік мяшання музычных стыляў Метал і Industrial. Іх гучанне ўяўляе сабой моцна скажоныя хэві-металічныя гітарныя рыфы і ня менш скажоны вакал, індустрыяльнага сінтэзатара і вокадэра.

З'яўленне новых стыляў метал-музыкі працягваецца і па сёння: нядаўна, да прыкладу, пра сябе заявіў новы стыль **Dance-metal**, стыль, існаванне якога шматлікія прыхільнікі і крытыкі абвяргаюць або лічаць стылем-правакацыяй, што падрывае асновы метал-музыкі.

**3. Заключэнне.** Гэтая музыка ніколі не была “моднай”, але і ніколі не выходзіла “з моды”, з моманту свайго з'яўлення метал-музыка заўжды мела “ўласную”, даволі вялікую аўдыторыю прыхільнікаў, існавала паралельна і незалежна ад іншых накірункаў музычнай культуры, але на сутыку з імі. Асэнсаванне шматаблічнай і неадназначнай з'явы Метал і ў якасці бізнэс-брэнда, і ў якасці мас-культуры дазволіць нам па-новаму разглядзець і зразумець працэсы ў культуры чалавецтва XX-XXI ст.ст.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Электронны рэсурс – Рэжым доступу: http://www.madonna-badgirl.ru/intervu/imj.htm. – Дата доступу 18.04.2009 г. ў 20.30.

2. Электронны рэсурс – Рэжым доступу: http://qton.ru/221.html – Дата доступу 09.03.2009 г. ў 19.23.

3. Электронны рэсурс – Рэжым доступу: http://ru.wikipedia.org/wiki/Metalmania – Дата доступу 12.04.2009 г. ў 23.45.

Электронны рэсурс – Рэжым доступу: http://wap.dodean.borda.ru/?1-1-20-00000038-000-0-0-1130602517 – Дата доступу 18.04.2010 г. ў 19.50.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ